## ПАЭТЫЧНЫМ РАДКОМ

**Галіна ЛАЗІЦКАЯ**

# Мелодыя восені

Прыгожая, цёплая, ціхая восень
Няспешнаю крочыць хадою.
Любуецца зверху нябесная просінь
І кліча яе залатою.

Суладдзе крыляе, пачуцці ўзнімае,
Шумлівай лістотай агучыць.
Навейвае радасць, настрой узмацняе
І гукаў напеўнасць далучыць.

Ваколле аздобяць росныя кроплі,
І выплыве сонца з-за хмаркі.
Ці шэранню сцеле доўгаю, вохкай,
Нагоніць халодныя ранкі.

А ветрыка подых букеты сплятае,
Майструе з іх цуда-карункі.
І добрая восень
красой абдымае,
Удзячныя шле падарункі.

